Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!
Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ, СОЎНАРКОМА
І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

66 (7392) | Серада, 11 красавіка 1945 г. | Цана 20 кап.

Шырыць соцыялістычнае спаборніцтва за ўраджай!

У рэспубліцы разгортваюцца палявыя работы, у радзе месц ідзе сяўба ранніх яравых культур. Следам за калгасамі Палесся і Гомельшчыны, сялянамі Брэсцкай і Пінскай абласцей да палявых работ прыступілі ў Магілеўскай, Бабруйскай і Мінскай абласцях. На вызваленай зямлі праклалі першыя барозны і калгасы самых паўночных абласцей рэспублікі—Полаччыны і Віцебшчыны.

Тэмпы палявых работ нарастаюць з кожным днём. Грукат трактараў будзіць наваколле. На палі выйшлі сівыя дзяды і падлеткі, жанчыны і дзяўчаты, выйшлі тысячы калгаснікаў і калгасніц, трактарыстаў і трактарыстак, сялян-аднаасобнікаў. На трактарах, конях, каровах яны арэуць, скародзяць, вывозяць угнаенне, сеюць, старанны упорнай працай змагаюцца за атрыманне ў гэтым годзе высокага ўраджаю перамогі над ворагам.

Прапоўны энтузіязм сялянства надзвычай вялікі. Яшчэ нядаўна пачаліся палявыя работы на Палессі, а ўжо калгас «Новае жыццё», Хойніцкага раёна, закончыў сяўбу ранніх яравых культур. Закончылі сяўбу ранніх збожжавых культур таксама калгасы «Пролетарый» і імені Калініна, Мазырскага раёна. Па тры нормы за дзень выконваюць трактарысты Нова-Беліцкай МТС, Гомельскай вобласці, Ціхан Сулейка і Сцяпан Рудзік. Высокую прадукцыйнасць працы паказваюць тысячы аратых, баранавальшчыкаў, сейбітаў.

Адказваючы на заклік кубанскіх хлебаробаў і палтаўскіх трактарыстаў, на заклік калгаснікаў сельгасарцелі імені Варашылава, Церахоўскага раёна, працаўнікі вёскі змагаюцца за хуткае аднаўленне разбуранай ворагам сельскай гаспадаркі Беларусі, за тое, каб у самы кароткі час давесці пасеўную плошчу да даваеннага ўзроўню.

«Галоўныя нашы клопаты цяпер—пасеяць вясной яравое збожжа на плошчы, роўнай даваеннай, і вырасціць высокі ўраджай,—пішуць у сваім звароце калгаснікі сельгасарцелі імені Варашылава.—Гэта—наш першы абавязак перад Чырвонай Арміяй. Гэта—важнейшая ўмова далейшага развіцця ўперад па шляху здраджэння арцельнага жыцця, без чаго мы не ўяўляем сабе і стварэнне асабістага добрабыту».

Уключыўшыся ў соцыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай 1945 года, калгаснікі сельгасарцелі імені Варашылава абавязаліся поўнасцю аднавіць пасеўную плошчу калгаса, атрымаць у гэтым годзе азімага жыта, ячменю і проса па 90 пудоў, аўса па 80 пудоў, яравой пшаніцы і грэчкі па 60 пудоў, ільносемя па 30 пудоў, ільновалакна па 20 пудоў і бульбы па 900 пудоў з кожнага гектара. Варашылаўны заклікаюць усіх калгаснікаў і калгасніц, трактарыстаў і трактарыстак, аграномаў, механікаў і інжынераў, усіх работнікаў сельскай гаспадаркі рэспублікі правесці веснавую сяўбу ў спісныя тэрміны і на высокім агратэхнічным узроўні.

У соцыялістычнае спаборніцтва ўступаюць усё новыя і новыя звенні, брыгады, калгасы, МТС, паасобныя калгаснікі і трактарысты. На нарадах перадавікоў сельскай гаспадаркі і сходах сялян заходніх абласцей Беларусі заключаны дагаворы на соцыялістычнае спаборніцтва паміж асобнымі раёнамі і абласцямі.

Задача партыйных і совецкіх арганізацый, работнікаў зямельных органаў, усіх большэвікоў вёскі—узначаліць і правільна накіраваць гэты магутны народны рух за заваяванне высокага ўраджаю. Вясна з'яўляецца рашаючым перыядам сельскагаспадарчага года. Пасеяць поўнасцю, своечасова і высокаякасна—гэта цяпер самая галоўная задача ў справе дапамогі фронту, у аднаўленні і ўмацаванні калгаснай гаспадаркі і стварэнні нармальных умоў жыцця насельніцтву.

Паспяховае правядзенне веснавой сяўбы ў многім залежыць ад работы машынна-трактарных станцый. На жаль, не ўсюды кіраўнікі МТС разумеюць гістарычную ролю трактарнага парка ў веснавой сяўбе гэтага года. Так, дырэктар Церахоўскай МТС тав. Мармулёў накіраваў у калгасы «2-я пяцігодка» і «4-ты завяршаючы» два трактары без плугоў і іншага прычэпнага інвентару. Трактары прыйшлі на ўчасткі і не могуць распачынаць работы. У Пролетарскай машынна-трактарнай станцыі, гэтага-ж раёна, 8 трактараў з-за адсутнасці каленчатых валаў яшчэ не гатовы да выхаду ў поле. Вялікая віна ў гэтым Гомельскай МТМ, якая за 4 месяцы не закончыла абточку валаў.

Трэба правільна выкарыстоўваць на палявых работах жывое пягло калгасаў, а таксама малапрадуктыўных кароў калгаснікаў. Толькі тады можна дабіцца высокай выпрацоўкі, калі будзе ліквідавана абязлічка ў доглядзе і эксплаатацыі коней, калі іх будуць узмоцнена карміць. Але так справы абстаяць далёка не ўсюды. У многіх калгасах Добрушскага раёна конскае пагалоўе знаходзіцца ў выключна дрэнным становішчы. З-за безгаспадарчых, а вельмі часта варварскіх адносін, тут паглядаецца вялікі падзеж коней. Нядзіва, што раён вельмі марудна разгортвае палявыя работы і сяўбу.

Першыя дні палявых работ паказваюць, што не ва ўсіх калгасах правільна арганізавана праца калгаснікаў. У калгасе «Чырвоны сцяг», Руэзенскага раёна, працуюць скопам, нормы выпрацоўкі на ворыве не ўстаноўлены, а ў выніку працадні аратым налічваюцца пароўну. Вядома, што пры такой арганізацыі працы не можа быць і гутаркі аб нарошчванні тэмпаў сяўбы, аб запікаўленасці калгаснікаў выпрацаваць, як мага больш працадзён.

Сеяць трэба хутка і высокаякасна—такая асноўная ўмова соцыялістычнага спаборніцтва калгасаў і МТС. За ажыццяўленне гэтага абавязацельства трэба па-сапраўднаму змагацца па палях. Ні ў якім разе нельга дапускаць мелкую, з агрэхамі апрацоўку глебы, сяўбу неканцыцыйным, непратручаным насеннем. У рэспубліцы асталося вельмі мала радковых сеялак, таму вельмі важна з максімальнай нагрузкай скарыстаць наяўныя сеялкі. Барацьба за захаванне вільгаці ў глебе з'яўляецца важнейшай умовай у заваяванні высокага ўраджаю. Трэба прадухіліць высыханне глебы і правесці баранаванне зяблевага ворыва.

Веснавая сяўба з'яўляецца баявым экзаменам для совецкіх, партыйных і зямельных работнікаў, для кіраўнікоў калгасаў, соўгасаў і МТС. Ад таго, як арганізуюць яны калгаснікаў, рабочых МТС і соўгасаў на паспяховае выкананне планаў сяўбы, на ўмелае спалучэнне ўсіх веснавых работ залежыць поспех справы. Выключна вялікую ролю ў барацьбе за своечасовае і высокаякаснае правядзенне сяўбы павінны адыграць аграномы.

Веснавая сяўба ў Беларусі разгортваецца ў знамянальныя для нашай радзімы дні, калі гераічная Чырвоная Армія разам з арміямі саюзнікаў дабіваюць фашысцкага звера ў яго логаве. Бліскучыя перамогі чырвоных воінаў на франтах Айчыннай вайны натхняюць хлебаробаў на гераічныя подвігі на палях. Няма сумнення, што калгаснікі і ўсё працоўнае сялянства рэспублікі прыкладуць усе сілы, каб веснавую сяўбу правесці ў лепшыя агратэхнічныя тэрміны і высокаякасна, каб заваяваць у гэтым годзе высокі ўраджай.

Узнімем-жа вышэй сцяг соцыялістычнага спаборніцтва за хуткае і высокаякаснае правядзенне веснавой сяўбы, за атрыманне ў гэтым годзе высокага ўраджаю!

Гутарка тав. І. В. Сталіна з Патрыархам Маскоўскім і ўсея Русі Алексіем

10 красавіка ў Старшыні Совета Народных Камісараў СССР тав. І. В. Сталіна адбылася гутарка па справах Праваслаўнай царквы з Патрыархам Маскоўскім і ўсея Русі Алексіем у прысутнасці Нікалая Мітрапаліта Крутіцкага і Протапрэсвітэра Нікалая Калчыцкага.

У гутарцы прымаў удзел Намеснік Старшыні Соўнаркома СССР тав. В. М. Молатаў.

Аднавіўся выхад газеты „Літаратура і Мастацтва"

Пасля перарыву аднавіўся выхад газеты «Літаратура і мастацтва»—орган Саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі і Упраўлення па справах мастацтва пры СНК БССР. Учора выйшаў першы ў гэтым годзе і 525-ты з дня заснавання нумар газеты.

«Жыве і квітнее беларуская совецкая культура»—такі загаловак носіць перадавы артыкул газеты. У нумары змешчаны артыкулы: дырэктара Тэатра оперы і балета тав. Міхейчыка «Адраджэнне опернага тэатра», М. Лынькова «Верная зброя народа», В. Нефела «Мастацтва і праўда», новыя вершы Максіма Танка і Аркадзя Куляшова, багатая хроніка літаратурнага і мастацкага жыцця рэспублікі.

Ад Совецкага Інформбюро

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 10 КРАСАВІКА

Па даных 3-га БЕЛАРУСКАГА фронта, пасля 21 гадзіны 30 м. 9 красавіка, г. зн. пасля спынення супраціўлення нямецкіх войск у Кенігсбергу, на працягу ночы з 9-га на 10-е і днём 10 красавіка здалася ў палон каля 50.000 нямецкіх салдат і афіцэраў.

Такім чынам, за час баёў па ліквідацыі Кенігсбергскай групіроўкі немцаў, г. зн. з 6-га па 10-е красавіка, узята ў палон усяго больш 92.000 нямецкіх салдат і афіцэраў.

За той-жа перыяд немцы страцілі забітымі да 42.000 салдат і афіцэраў.

У ліку палонных 1.819 афіцэраў і 4 генералы — камендант кенігсбергскага ўмацаванага раёна генерал ад інфантэрыі Ляш, намеснік каменданта крэпасці генерал-лейтэнант Мікош, камандзір 61-й нямецкай пяхотнай дывізіі генерал-лейтэнант Шперль, камандзір 367-й нямецкай пяхотнай дывізіі генерал-маёр Хенле.

Войскі фронта захапілі наступныя трафеі: палявых гармат — 2.023, танкаў і самаходных гармат—89, мінамётаў—1.652, кулямётаў—4.673, бронетранспарцёраў—119, бронепаяздоў—2, аўтамашын—8.560, трактараў і цягачоў—137, паравозаў — 774, вагонаў—8.544, кацераў і барж—146, складаў з ваеннай маёмасцю — 441.

Знішчана: самалётаў — 120, палявых гармат—1.193, мінамётаў—568, танкаў і самаходных гармат—104, бронетранспарцёраў—82, аўтамашын—1.719, паравозаў — 23, вагонаў — 215, складаў з ваеннай маёмасцю — 77.

На працягу 10 красавіка на Земландскім паўвостраве на захадзе ад Кенігсберга войскі 3-га БЕЛАРУСКАГА фронта з баямі занялі населеныя пункты: МЕТГЕТЭН, МОДЫТЭН, КЛАЙН ФРЫДРЫХСБЕРГ, ГРОС ХОЛЬШТАЙН.

На паўночным усходзе і ўсходзе ад БРАЦІСЛАВЫ войскі 2-га УКРАІНСКАГА фронта, прадаўжаючы наступленне, занялі на тэрыторыі Чэхаславакіі горад ТРЭНЧЫН і больш 30 іншых населеных пунктаў, у тым ліку ВЕЛКІ Б'ЕРОЎЦЭ, МІАЎЦІ, ПАНЫЦЫ, КАДЛЕЧЫЦЫ, МІЧЭ, ХРОПАЎ, КОЗАЛЕВЕЦ, ПОПУДЗІНІ. На паўночным захадзе і захадзе ад БРАЦІСЛАВЫ войскі фронта, наступаючы па паўночнаму берагу ДУНАЯ, занялі гарады ГЕНЗЕРНДОРФ і ДОЙЧ-ВАГРАМ і населеныя пункты ВАЙКЕНДОРФ, ШТРАСХОФ, МАРКГРАФКОЙЗІДЛЬ ПАРБАСДОРФ, ГРОСХОФЕН, ГЛІНЦЭНДОРФ, РУТЦЭНДОРФ, ФРАНЦЭНСДОРФ, ВІТАУ, ОБЕРХАУЗЕН, МЮЛЬЛАЙТЭН.

Войскі 3-га УКРАІНСКАГА фронта, прадаўжаючы вулічныя баі ў ВЕНЕ, ачысцілі ад праціўніка ўсе гарадскія раёны, размешчаныя на заходнім беразе Дунайскага канала. У баях за 9 красавіка войскі фронта ўзялі ў палон больш 2.000 салдат і афіцэраў праціўніка і захапілі наступныя трафеі: танкаў—72, бронетранспарцёраў—85, палявых гармат—75, кулямётаў—174.

На астатніх участках фронта — істотных змен не было.

За 9 красавіка на ўсіх франтах падбіта і знішчана 54 нямецкія танкі. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 28 самалётаў праціўніка.

* * *

УДАРЫ НАШАЙ АВІЯЦЫІ ПА ПАРТАХ ПІЛАУ І ХЕЛЬ

У ноч на 10 красавіка нашы пяжкія бамбардыроўшчыкі нанеслі ўдар па партах Пілаў і Хель. У выніку гэтых удараў на тэрыторыях указаных партоў узніклі вялікія пажары, якія суправаджаліся моцнымі выбухамі.

* * *

На паўночным усходзе ад Браціславы совецкія часці з баямі выйшлі да ракі Ваг на поўначы ад чэхаславацкага горада Трэнчын. Другія нашы часці прабіліся да ракі на поўдні ад горада. Нямецкі гарнізон, які абараняў Трэнчын, аказаўся прыціснутым да ракі. Нашы войскі з двух бакоў уварваліся ў горад і да палудня ачысцілі яго ад праціўніка. Рэшткі разгромленага варожага гарнізона ўцяклі за раку Ваг. Захоплены ружэйна-рамонтныя майстэрні, 20 падземных складаў з боепрыпасамі і іншыя трафеі. У горадзе Трэнчыне ёсць аўтатрактарны і аружэйны заводы, завод узрыўчатых вяшчэстваў і іншыя прадпрыемствы.

У раёне паміж рэкамі Ваг і Морава, совецкія пехацінны, адбіваючы контратакі праціўніка, настойліва прасоўваюцца ўперад. У выніку жорсткага бою занят апорны пункт Попудзіні, які знаходзіцца ў 9 кілометрах ад горада Годонін. У баі за гэты пункт знішчана да 400 гітлераўцаў і спалена 7 нямецкіх танкаў. На паўночным захадзе і захадзе ад Браціславы нашы войскі, прарваўшы абарону праціўніка, прасунуліся ўперад па 20 кілометраў. Занят горад і чыгуначная станцыя Дойч-Ваграм, размешчаныя ў 13 кілометрах на паўночным усходзе ад Вены. За два дні баёў у гэтым раёне совецкія часці захапілі ў немцаў 108 гармат, 42 мінамёты, 59 кулямётаў, 7 паравозаў і 300 чыгуначных вагонаў з ваеннай маёмасцю.

* * *

Войскі 3-га Украінскага фронта прадаўжалі паспяховыя вулічныя баі ў Вене. Ператварыўшы аўстрыйскую сталіцу ў поле бою, немцы мелі намер весці ў горадзе зацяжную барацьбу. Яны прыкладалі адчайныя намаганні, каб стварыць на вуліцах горада трывалую і ўстойлівую абарону. Рашучымі дзеяннямі совецкіх войск планы гітлераўцаў былі сарваны. Ачышчаны ад праціўніка ўсе гарадскія раёны, размешчаныя на заходнім беразе Дунайскага канала. Нашы войскі, якія наступаюць з паўночнага захада, уздоўж Дунайскага канала, з баямі выйшлі да цэнтра горада і злучыліся з войскамі, што наступаюць з поўдня і захада. Заняты будынкі вакзала Франца Іосіфа, гарнізоннага шпіталю, кавалерыйскіх казарм, акадэміі навук і іншыя. Зрабіўшы паспяховы абходны манеўр, нашы гвардзейскія злучэнні акружылі групу праціўніка ў прыгарадах Альтмансдорф, Ацгерсдорф, Альтэрлаа і Нейерлаа. Трапіўшыя ў «кацёл» падраздзяленні двух нямецкіх эсэсаўскіх танкавых дывізій, запасны полк і 6 асобных батальёнаў сёння раніцай былі ліквідаваны. Захоплена многа трафеяў. На вуліцах прыгарадаў асталося звыш 3.000 варожых трупаў.

У баях за вызваленне Вены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў совецкія воіны праяўляюць беззаветную мужнасць і геройства. Адзяленне гвардыі старшага сержанта Мядзведзева, прасоўваючыся ўперад, знішчыла вялікую групу гітлераўцаў. Кулямётчык Андрушэнка, прыкрываючы наступленне свайго падраздзялення, знішчыў 20 немцаў. Артылерысты батарэі капітана Куўшынова спалілі два танкі праціўніка. Гвардыі чырвонаармейцы Крэмасоў і Немноў уплаў пераправіліся праз водны рубеж, уступілі ў бой з немцамі і забяспечылі пераправу свайго падраздзялення. У гэты дзень тт. Крэмасоў і Немноў знішчылі 37 гітлераўцаў. На двух снайпераў гвардыі чырвонаармейцаў Макарэнка і Хідзенка напала група немцаў. У жорсткай схватцы адважныя байцы забілі 6 гітлераўцаў, а аднаго нямецкага салдата ўзялі ў палон. Гвардыі старшы сержант Чэрэмісаў, умела маскіруючыся, падпоўз да дома, у якім заселі нямецкія кулямётчыкі. Кінуўшы ў вакно гранату, старшы сержант знішчыў варожых кулямётчыкаў. У той-жа дзень тав. Чэрэмісаў процітанкавай гранатай падарваў нямецкую самаходную гармату.

* * *

Палонны камандзір 6 роты 2 мотапалка 1 танкавай дывізіі СС «Адольф Гітлер» оберштурмфюрэр Курт Штэльмахер расказаў: «У снежні мінулага года наша дывізія прымала ўдзел у наступленні нямецкіх войск на Заходнім фронце. Спачатку аперацыя развівалася паспяхова і нам удалося захапіць значную тэрыторыю. У студзені рускія перайшлі ў наступленне. Нямецкае камандаванне пачало перакідваць войскі на совецка-германскі фронт. Нашу дывізію адправілі ў Венгрыю, у горад Дзьер, куды мы прыбылі ў канцы лютага. Многія салдаты выказвалі нездавальненне тым, што ім прыходзіцца ваяваць у Венгрыі. Яны гаварылі паміж сабой: «Англа-амерыканскія войскі награжаюць Рурскай вобласці, а мы гінем тут замест таго, каб абараняць нямецкую тэрыторыю». Па загаду камандзіра дывізіі брыгадэнфюрэра Кум афіцэры павінны былі штодзённа растлумачваць салдатам, чаму нам неабходна абараняць Венгрыю і адкінуць рускіх за Дунай. Аднак наступленне, якое каштавала нам велізарных страт, хутка выдахнулася. Затым рускія войскі самі перайшлі ў наступленне і разграмілі нашы лепшыя дывізіі».

Прыём у югаслаўскім пасольстве ў чэсць Старшыні Совета Міністраў Югаславіі Маршала І. Броз-Тіто

9 красавіка Пасол Югаславіі ў СССР пан С. Сімч наладзіў прыём у чэсць Старшыні Совета Міністраў Югаславіі Маршала І. Броз-Тіто.

На прыёме прысутнічалі Маршал І. Броз-Тіто, Народны Камісар Замежных Спраў СССР В. М. Молатаў, Народны Камісар Знешняга Гандлю А. І. Мікаян, Народныя Камісары СССР Адмірал Флота Н. Г. Кузнецоў, А. І. Шахурын, Б. Л. Ванніка, В. А. Малышэў, Д. Ф. Устінаў, П. Ф. Ламака, Намеснікі Народнага Камісара Замежных Спраў СССР А. Я. Вышынскі, С. А. Лазоўскі, С. І. Каўтарадзе, І. М. Майскі, Пасол СССР у Югаславіі І. В. Садчыкаў, Маршал Совецкага Саюза С. М. Будзённы, Народны Камісар Замежных Спраў УССР Д. З. Мануільскі, А. Ф. Горкін, Начальнік Генеральнага Штаба Чырвонай Арміі генерал Арміі А. І. Антонаў, Старшыня Маскоўскага Гарадскога Совета Г. М. Папоў, Старшыня ВЦСПС В. В. Кузнецоў, Маршал авіяцыі Ф. Я. Фалалееў, Маршал інжынерных войск М. П. Вараб'ёў, генерал-палкоўнік Ф. І. Голікаў, адказныя супрацоўнікі НКЗС СССР, НКА, прадстаўнікі совецкага і замежнага друку, пісьменнікі і артысты.

На прыёме прысутнічалі паслы і пасланнікі замежных дзяржаў, ваенныя аташэ, Начальнікі Ваенных Місій саюзных і нейтральных краін.

На прыёме таксама прысутнічалі вядомыя югаслаўскія дзеячы, якія знаходзяцца ў Маскве: Міністр Замежных Спраў пан І. Шубашыч, Міністр па Справах Чорногорыі генерал-лейтэнант М. Джылас, Міністр Гандлю і Снабжэння пан Н. Петровіч, Міністр Горнай прамысловасці пан Б. Андрэеў, Начальнік Югаслаўскай ваеннай місіі ў СССР генерал-лейтэнант Р. Прыморац, члены Пасольства і Ваеннай Місіі Югаславіі ў СССР.

(ТАСС).

Дэкларацыя чэхаславацкага ўрада

КОШЫЦЭ, 8 красавіка. (ТАСС). 5 красавіка прэм'ер-міністр Здэнек Фірлінгер агласіў на пасяджанні славацкага нацыянальнага совета ў Кошыцэ дэкларацыю новага чэхаславацкага ўрада:

«Урад, як гэта вынікае з яго праграмы,—гаворыцца ў дэкларацыі,—павінен быць урадам шырокага народнага фронта чэхаў і славакаў, складзеным з прадстаўнікоў усіх соцыяльных слаёў і палітычных напрамкаў, якія на радзіме і за мяжой вялі вызваленчую барацьбу за звяржэнне нямецкай і венгерскай тыраніі».

«Сёння,—гаворыцца далей у дэкларацыі,—калі ўрачыстае пасяджанне зноў асвятляе і ўмацоўвае нашу непарыўную брацкую сувязь, гераічная Чырвоная Армія выганяе астатнія рэшткі нацыстскіх ордаў з межаў славацкай зямлі і ўжо стаіць на мараўскіх граніцах. Над Браціславай ужо развяваецца сцяг свабоднай Чэхаславакіі. Сонца свабоды ўзыходзіць таксама над заняволеным чэшскім краем. Аддадзім чэсць гераічнай Чырвонай Арміі, якая прайшла пабеданосны шлях ад Волгі да Одэра і якая стаіць сёння ля варот Берліна, за тыя шчаслівыя мінуты, якія яна нам дала. З глыбокай падзякай мы думаем аб усім совецкім народзе, які бяспрыкладным самаафяраваннем на працягу такога доўгага часу прыносіў самыя пяжкія афяры. Успомнім аб вялікіх совецкіх дзяржаўных мужах, і перш за ўсё аб Маршале Сталіне, якія з незвычайным разуменнем адносіліся да нашай барацьбы, падтрымлівалі яе і падрыхтоўвалі шчаслівае вырашэнне чэхаславацкай праблемы і наша поўнае вызваленне. Успомнім і астатніх нашых саюзнікаў, а іменна Вялікабрытанію і ЗША, якія аказвалі нам такую значную дапамогу і садзейнічалі дасягненню агульнай перамогі. З глыбокай падзякай мы ўспамінаем усіх патрыётаў, паўшых на ўнутраным фронце барацьбы і ўсіх, паўшых афярамі гестапа і канцэнтрацыйных лагераў».

«Урад, — гаворыцца далей,—лічыць сваю місію абмежаванай у часе, але ён усведамляе размеры задач і пяжкасці іх ажыццяўлення. Перш за ўсё мы павінны аказацца дастойнымі памочнікамі нашых вялікіх саюзнікаў. Мы павінны ўсімі даступнымі нам сродкамі падтрымліваць наступаючую Чырвоную Армію. Мы будзем арганізоўваць тыл, які пераходзіць у наша ўпраўленне, маючы на ўвазе, перш за ўсё, задачы фронта. Мы жадаем паскорыць далейшую паспяховую арганізацыю нашай уласнай арміі і прадаставіць ёй усё, у чым яна можа мець патрэбу».

«Наша новая знешняя палітыка, — указваецца ў дэкларацыі,—вызначаецца не толькі геаграфічным становішчам нашай дзяржавы, не толькі вядомымі марамі нашага народа і сённешняй нашай агульнай барацьбой, якую мы вядзем у самым песным супрацоўніцтве з Совецкім Саюзам, але таксама і чэхаславацка-совецкім дагаворам ад 12 снежня 1943 года аб дружбе, узаемнай дапамозе і пасляваенным супрацоўніцтве. Мы перакананы, што з дапамогай Совецкага Саюза будзе завершана вызваленне Чэхаславацкай рэспублікі і пры яго падтрыманні будуць назаўсёды забяспечаны яе свабода і бяспека, а таксама яе далейшае шчаслівае развіццё. Агульныя граніцы, якія мы будзем мець з нашым вялікім усходнім суседам, дадуць нам магчымасць устанавіць узаемныя сувязі, якія будуць праяўляцца як у ваеннай, так і ў эканамічнай і культурнай галінах.

З прычыны таго, што мы мяжуемся з Совецкай Украінай, мы будзем клапаціцца аб самых песных брацкіх адносінах з вялікім брацкім украінскім народам. Нішто не перашкаджае нашаму пастаяннаму супрацоўніцтву. Пытанне аб Карпацкай Украіне будзе вырашана намі ў згодзе з воляй украінскага насельніцтва Карпацкай Украіны, выказанай дэмакратычным шляхам і ў поўнай дружбе паміж Чэхаславакіяй і Совецкім Саюзам.

З пяперашняй барацьбы супроць нашага агульнага ворага, супроць імперыялістычнай Германіі ўсе славянскія народы выходзяць адроджанымі, а іх дэмакратычныя сілы ўмацаванымі. Славянскія народы раз назаўсёды вызваліліся ад пагубных уплываў і ўмяшання са зне, пагражаўшых іх свабодзе. Яны ўсведамляюць, што іх барацьба супроць нацыскай Германіі без зкытуўнай і дзейснай дапамогі Совецкага Саюза была-б дарэмнай, а таму лічыцца натуральным, што ўсе славянскія народы, без выключэння, групіруюцца сёння каля свайго вялікага саюзніка — Совецкага Саюза, шчырая і паслядоўная палітыка якога праследуе вялікую мэту—забяспечыць назаўсёды поўную незалежнасць і свабоду ўсіх славянскіх дзяржаў.

Таму ўрад будзе лічыць важнай задачай умацаванне і паглыбленне ў духу чэхаславацка-совецкага дагавору ад 12 снежня 1943 года сваёй дружбы з новай дэмакратычнай Польшчай, каб як мага хутчэй ажыццявіць тройственны чэхаславацка-совецка-польскі пакт, памянёны ў дагаворы. Мы перакананы, што нашы адносіны да новай польскай дзяржавы будуць з самага пачатку пастаўлены на новую аснову, па аснову славянскага брацтва, якому нішто не будзе пагражаць.

Зусім натуральна, што ўрад як мага хутчэй урэгулюе свае адносіны з новай Югаславіяй, у духу нашай традыцыйнай дружбы з югаслаўскім народам, які ў самыя цяжкія для нас часы праявіў у адносінах Чэхаславакіі такую глыбокую сімпатыю і які ў гэтай вайне праявіў так многа мужнасці.

Мы ўступім у песную брацкую сувязь з адроджанай Балгарыяй, якая скінула з сябе ўладу Кобургаў. Гэтая сувязь адпавядае духу славянскага садружаства.

Гэты славянскі напрамак у нашай знешняй палітыцы не будзе нам перашкаджаць у тым, каб захаваць нашы традыцыйныя добрыя адносіны з заходнімі вялікімі дзяржавамі, г. зн. з англа-саксонскай дэмакратыяй і адроджанай дэмакратычнай Францыяй».

Адзначыўшы, што «ўрад будзе імкнуцца пабудаваць новую дзяржаву на пачатках сапраўднай дэмакратыі, а таму будзе захоўваць цалкам і паслядоўна ўсе канстытуцыйныя свабоды і не будзе дапускаць дыскрымінацыі грамадзян рэспублікі па расавых прызнаках», дэкларацыя заяўляе, што Чэхаславакія, аднак, «не павінна больш аслабляцца нелаяльнай палітыкай чужых неславянскіх меншасцей, якія ў большасці выпадкаў сталі паслухмянай зброяй нацыскай Германіі і рэакцыйнай Венгрыі Хорці супроць рэспублікі».

У дэкларацыі заяўляецца, што будуць адданы пад суд усе ваенныя злачынцы без адрознення нацыянальнасці, усе здраднікі, усе свядомыя і актыўныя памочнікі нямецкіх і венгерскіх прыгнятальнікаў і што павінны быць пакараны не толькі асобы, якія зрабілі зладзеянні на чэхаславацкай тэрыторыі, але таксама і тыя, якія вінаўны перад другімі народамі і, у першую чаргу, перад народамі, саюзнымі з Совецкім Саюзам.

«У эканамічнай галіне,—указваецца ў дэкларацыі,—дзяржава павінна прадпрыняць сур'ёзныя меры, каб вызваліць народную гаспадарку поўнасцю ад іншаземнага ўплыву і перадаць народнаму ўпраўленню ўсю маёмасць, што знаходзіцца ва ўласным карыстанні грамадзян варожых дзяржаў, асабліва Германіі і Венгрыі, нямецкіх і венгерскіх грамадзян Чэхаславацкай рэспублікі, якія актыўна дапамагалі немцам пры разгроме Чэхаславакіі і яе акупацыі, а таксама ўсіх астатніх чэхаславацкіх грамадзян, якія здрадзілі народу і актыўна дапамагалі нямецкім і венгерскім акупантам.

Урад будзе кіравацца імкненнем раз назаўсёды вырваць чэшскую і славацкую зямлю з рук іншаземнай нямецкай і венгерскай шляхты, а таксама з рук здраднікаў народа і перадаць яе чэшскаму і славацкаму сялянству і беззямельным асобам.

У дэкларацыі ўказваецца, што паспяховае выкананне пяжкіх задач эканамічнага абнаўлення прадугледжвае, каб уся грашовая і крэдытная сістэма, прадпрыемствы асноўных галін прамысловасці, прыродныя і энергетычныя крыніцы былі падпарадкаваны ўсеагульнаму дзяржаўнаму ўпраўленню і пастаўлены на службу народнай эканомікі, садзейнічаючы ажыўленню вытворчасці і гандлю. Урад пакладаецца таксама аб тым, каб забяспечыць усялякую дапамогу Чэхаславакіі са зне, а асабліва з боку Совецкага Саюза.

«Наш урад,—гаворыцца ў заключэнні,—жадае быць выканаўцам волі народа, які гаворыць ад яго імені, абаронцам яго інтарэсаў. Няхай у дружнай, агульнай, брацкай рабоце мацнее і квітнее брацкая сувязь чэшскага і славацкага народаў, няхай з полымя агульнай барацьбы Чэхаславацкая рэспубліка выйдзе ўпутрана аб'еднанай і назаўсёды загартаванай».

УКАЗ
Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР

АБ ПРЫСВАЕННІ ЗВАННЯ ЗАСЛУЖАНАГА ДЗЕЯЧА МАСТАЦТВАЎ БССР ГАЛОЎНАМУ РЭЖЫСЁРУ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА ІМЕНІ ЯКУБА КОЛАСА тав. ЛОЙТЭРУ Нухіму Борухавічу

У сувязі з 25-годдзем творчай тэатральнай дзейнасці, за асабліва выдатныя дасягненні ў галіне сцэнічнага тэатральнага мастацтва прысвоіць званне Заслужанага дзеяча мастацтваў БССР тав. Лойтэру Нухіму Борухавічу — галоўнаму рэжысёру Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імені Якуба Коласа.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Н. НАТАЛЕВІЧ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Л. ПАПКОЎ.

7 красавіка 1945 года.
г. Мінск.

УКАЗ
Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР

АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ГРАМАТАМІ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР ЛЕПШЫХ ПЕРАКЛАДЧЫКАЎ ТВОРАЎ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ І ПАЭТАЎ

За праяўленую выключную ўвагу да пераклада твораў беларускай літаратуры на рускую мову, рускіх паэтаў і пісьменнікаў, якія асабліва вызначыліся, узнагародзіць Граматамі Вярхоўнага Совета БССР:

1. Бродскага Давіда.
2. Галоднага Міхаіла Семёнавіча
3. Гарадзецкага Сергея Мітрафанавіча
4. Ірыніна Барыса Сергеевіча
5. Ісакоўскага Міхаіла Васільевіча
6. Мазалькова Еўгенія Семёнавіча
7. Осіна Дзмітрыя Дзмітрыевіча
8. Рыленкова Нікалая Іванавіча
9. Сомыніна Петра Андрэевіча
10. Турганава Барыса Александравіча.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Н. НАТАЛЕВІЧ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Л. ПАПКОЎ.

7 красавіка 1945 г.
г. Мінск

СЕЯЦЬ ХУТКА І ВЫСОКАЯКАСНА!

БОЛЬШАСЦЬ КАЛГАСАЎ ВЫЙШЛА НА ПАЛІ

ВІЦЕБСК. (Па тэлефону). Большасць калгасаў абласці выйшла на палі.

Асабліва дружна ідуць работы ў Чашнікім раёне. У калгасе «Чырвоны сцяг» шосты дзень 46 калгаснікаў на конях і каровах узорваюць глебу. Паміж брыгадамі і асобнымі калгаснікамі шырока разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва за хутчэйшае і высокаякаснае правядзенне сяўбы. Калгаснікі В. Крыцкі, Г. Курага і Л. Пянько на ворыве штодзённа выконваюць па 2—3 нормы. У калгасе «Вышкавічы», Альшанскага сельсовета, засеяна два гектары аўса. Арганізавана распачалі палявыя работы калгаснікі сельгасарцелі «Шлях соцыялізма». На ворыве тут штодзённа працуе 16 кароў. Брыгадзір калгаса Цімафей Гавай на ўласнай карове нормы ворыва выконвае на 130 процантаў. У калгасе засеяна ўжо 5 гектараў аўса. На поле выйшла і агітатар Марыя Александровіч, якая ў абавязены перапынак праводзіць з калгаснікамі цікавыя гутаркі, чытае газеты.

Калгаснікі сельгасарцелі «Полымя», Каменскага сельсовета, Лепельскага раёна, узаралі 10 гектараў глебы. Калгаснікі сельгасарцелі «Яскравы прамень», Вараньскага сельсовета, добра падрыхтаваліся да веснавой сяўбы, прывучылі да работы 15 кароў. Калгасніцы Вольга і Ніна Канько аднаконным плугам за дзень узорваюць на каровах па 0,30 гектара.

Палявыя работы распачалі многія калгасы Аршанскага, Лёзненскага, Багушэўскага і іншых раёнаў абласці. Распачалі работы трактарысты Багушэўскай МТС.

Анатолій СТУК.

Небывалы ўздым

БАРАНАВІЧЫ. (Па тэлефону ад кар. «Звязды»). Усё больш калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў абласці ўключаюцца ў соцыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай.

Ва ўсіх раёнах разгортваецца ворыва і сяўба. Па абласці ўзарана ўжо больш 8.000 гектараў глебы і пасеяна 1.800 гектараў ранніх яравых культур. Сяляне Мяжэвіцкага сельсовета, Слонімскага раёна, узаралі больш 120 гектараў і засеялі аўсом 30 гектараў.

Паспяхова праходзяць палявыя работы ў Несвіжскім раёне. Тут асабліва ўзорна працуюць калгаснікі сельгасарцелі «Чырвоны бераг» і «17 верасня». Аратыя калгаса «Чырвоны бераг» дзённыя нормы выпрацоўкі выконваюць на 130—150 процантаў. Гэты калгас падрыхтаваў да сяўбы 55 гектараў глебы і пасеяў 25 гектараў аўса і 5 гектараў ільну.

Калектыў соўгаса «Туча», Клецкага раёна, па-большэвіцку змагаецца за паспяховае правядзенне веснавой сяўбы. Адказваючы на заклік палтаўскіх трактарыстаў, трактарысты соўгаса за тры дні падрыхтавалі да сяўбы 80 гектараў глебы і пасеялі 30 гектараў аўса.

Перад пачаткам палявых работ у Ляхавіцкім, Стаўбцоўскім, Слонімскім, Гарадзішчанскім, Клецкім і іншых раёнах абласці былі праведзены нарады агітатараў. Цяпер агітатары выйшлі на палі і праводзяць з сялянамі гутаркі і чыткі газет.

П. ЦВІРКО.

МАСАВЫЯ ПАЛЯВЫЯ РАБОТЫ

ГРОДНА, 10 красавіка. (БЕЛТА). Калгасы і аднаасобныя гаспадаркі Скідэльскага раёна прыступілі да веснавых палявых работ. Ужо ўзарана 310 і засеяна 48 гектараў. Трактарысты Шчучынскай МТС у калгасах «Перамога» і «Першае Мая» прыступілі да перадпасеўнай культывацыі.

ТЭМПЫ РАБОТЫ НАРАСТАЮЦЬ

ХОЙНІКІ. (Кар. «Звязды»). Калгаснікі раёна разгортваюць масавыя палявыя работы. Штодзень тэмпы работ нарастаюць. Наперадзе ідуць калгасы Тульгавіцкага і Алексінкага сельсоветаў. Добрая арганізацыя працы ў брыгадах і звеннях спрыяе павышэнню прадукцыйнасці працы аратых, сейбітаў. Асобныя калгаснікі нормы ворыва перавыконваюць у паўтара-два разы. Калгасніца Юлія Чэркас штодня ўзорвае па 0,64 гектара.

Дружна і арганізавана працуюць у калгасе «Колас», Паселіцкага сельсовета. 25 аратых гэтага калгаса за апошнія тры дні ўзаралі больш 55 гектараў. Пяршынства трымае брыгада Цімафея Алейніка. На ўчастку гэтай брыгады развіваецца пераходны Чырвоны сцяжок. Адданай работай змагаюцца тут за ўтрыманне сцяжка на ўвесь час сяўбы. Калгаснікі гэтай брыгады Алесь Апанасенка, Фёдар і Нікалай Алейнікі дабіліся рэкордных выпрацоўкі на ворыве. Яны штодня ўзорваюць па 1,11 гектара, кожны перавыконвае норму ў два разы з лішнім.

У гэтым калгасе таксама арганізавалі ручную апрацоўку глебы. 70 жанчым-калгаспіц штодня працуюць у полі з рыдлёўкамі. На чале гэтай брыгады маці-гераіня, жонка старшыні сельсовета. К. Алейнік. Не астаюцца ў баку і вучні старшых класаў. Днямі дырэктар Звеніцкай школы Екацярына Алейнік арганізавала выхад на палявыя работы 50 вучняў старшых класаў. За дзве гадзіны яны ўскапалі рыдлёўкамі 0,75 гектара глебы.

Сяўба разгортваецца. Тысячы калгаснікаў і калгаспіц, старых і падлеткаў спаборнічаюць з калгасамі Брагінскага раёна за высокую якасць палявых работ і своечасовае правядзенне веснавой сяўбы.

У калгасах арганізуюць баранаванне і падкормку азімых пасеваў, што ў значнай меры павысіць іх ураджайнасць.

Калгаснікі раёна стараюцца засеяць коннымі радковымі сеялкамі не менш 1.250 гектараў і трактарнымі сеялкамі—не менш 1.000 гектараў.

Калгаснікі Хойніцкага раёна сабралі 1.500 цэнтнераў насення для дапамогі найбольш пацярпеўшым ад нямецкіх акупантаў калгасам Петрыкаўскага раёна.

Г. СЯРГЕЕНКА.

Лёс ураджаю вырашаецца ў брыгадзе

Праўленне нашага калгаса звяртае вялікую ўвагу на ўмацаванне паляводчых брыгад і звеньняў, ад работы якіх залежыць лёс будучага ўраджаю. Зімовымі днямі мы перагледзелі асабовы састаў брыгад, абмеркавалі іх планы сяўбы, магчымасці і рэзервы, удакладнілі зямельныя ўчасткі, замацавалі сельскагаспадарчы інвентар, збрую, цягло.

Нашай брыгадзе трэба засеяць 110 гектараў усіх культур. Намі складзен і зацверджан рабочы план на час веснавой сяўбы. Паміж калгаснікамі размеркаваны ўсе работы. Стары і малы ведае сваё месца ў полі.

Пры размеркаванні работ улічваліся асабістыя здольнасці і магчымасці калгаснікаў. Так, напрыклад, старым калгаснікам Васілю Церашонак і Нікіту Кукушкіну цяжка хадзіць за плугам ці за бараной, яны згадзіліся працаваць сейбітамі. Старык Іван Вангельскі падвозіць ім насенне. Аратымі прызначаны Марыя Касцюкова, Арына Церашонак, Марыя Жукава і Сцяпан Касцюкоў. У мінулым годзе яны добра вызначыліся на ворыве. За імі замацаваны цяглавая сіла, інвентар і збруя.

Наша брыгада першай у калгасе завяршыла падрыхтоўку да сяўбы, выйшла пераможцай у соцыялістычным спаборніцтве. За зімні час на адведзеную нам плошчу вывезена 2.000 вазоў гною. Вывазка і зараз не спыняецца. Калгасніцы Жукава, Церашонак і другія рэгулярна перавыконваюць нормы. Яны ведаюць і цэняць народную мудрасць: «Кладзі гной густа—не будзе ў клеці пуста». Сельскагаспадарчы інвентар—18 плугоў, 14 боран, 10 калёс—у поўнай спраўнасці. На рамонце калёс многа папрацаваў старык Нікіта Кукушкін. Калгаснікі Андрэй Шарымаў і Пілып Лебедзеў падрыхтавалі дастаткова збруі.

На кожнага рабочага каня ў нас прыпадае апрацаваць 8 гектараў глебы. Усе 13 коней добрай укормленасці. Гэта вынік добрасумленнай працы конюха Емельяна Аўдзеева.

Мы распачалі веснавыя палявыя работы арганізавана. Сваё абавязацельства—дабіцца не менш 90 пудоў збожжавых з гектара—выканаем з чэсцю.

Кірыл КАЗАКОЎ,
брыгадзір 2-й паляводчай брыгады калгаса «Комінтэрн», Магілеўскага раёна.

Каровы на ворыве

ПУХАВІЧЫ. (Кар. «Звязды»). Яшчэ ўвосень мінулага года калгаснікі сельгасарцелі «17 партз'езд», Слабодскага сельсовета, узнялі пытанне аб прывучэнні да палявых работ малапрадуктыўных кароў. У гэтым калгасе асталося толькі 6 рабочых коней. І, зразумела, што гэтымі коньмі калгасу не апрацаваць усёй сваёй плошчы.

Калгаснікі прывучылі да палявых работ 24 каровы. Прыклад у гэтым паказаў старшыня праўлення Зміцер Гурыновіч і брыгадзір Апанас Гурыновіч. Яны першымі запрэглі ў плугі сваіх уласных кароў і ўзорваюць імі па 35—40 сотак зямлі. На каровах тут арэць, возяць на поле гной.

Прывучаюць кароў да палявых работ і калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Трэці рашаючы». 7 малапрадуктыўных кароў калгаснікаў гэтай арцелі працуюць ужо на ворыве.

Днямі да калгаснікаў арцелі «Трэці рашаючы» дайшлі весткі пра зварот кубанскіх калгаснікаў. Быў склікан агульны сход, дзе падрабязна абмеркавалі і прачыталі выклік на соцыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай. Калгаснікі ўключыліся ў спаборніцтва і адказваюць кубанцам стаханаўскай працай на сяўбе.

У калгасе «Трэці рашаючы» ўжо ўзарана 90 гектараў глебы. На 17 гектарах пасеяна яравое жыта. Узорна працуюць калгасныя аратыя Пётр Лінник і Сцяпан Падаляка. Працуючы на валах, яны штодня ўзорваюць па 0,80 гектара. Якасць іх работы добрая.

280 звенняў высокага ўраджаю

ГЛУСК, 10 красавіка. (БЕЛТА). У калгасах раёна з кожным днём расшыраюцца палявыя работы. На палі выйшлі больш 280 звенняў высокага ўраджаю. Сельгасарцелямі ўзарана звыш 500 гектараў і каля 300 гектараў засеяна яравога кліну.

Добра працуюць на палях калгаснікі сельгасарцелі «Юны баранцбіт». Тут на палявых работах шырока выкарыстоўваюцца малапрадуктыўныя каровы. За першыя дні калгаснікі ўзаралі і засеялі больш 50 гектараў.

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

Часопіс „Беларусь" № 6

Выйшаў з друку чарговы, шосты нумар двухмесячнага грамадска-палітычнага і літаратурнага часопіса «Беларусь».

Знамянальна тое, што выданне названага часопіса пачалося ў дні, калі Беларусь была яшчэ акупіравана нямецкімі захопнікамі. Некалькі нумароў часопіса былі выданы ў Маскве і адтуль засылаліся ў першыя вызваленыя раёны Гомельскай, Палескай і Магілеўскай абласцей і праз лінію фронта—у партызанскія атрады і брыгады.

Ужо з першага свайго нумару часопіс ярка афарміўся як з пункту гледжання напрамку сваёй работы, узнімаемых пытанняў, так і з боку тэхнічнага. Усім сваім зместам і выглядам нумары часопіса «Беларусь» робяць прыемнае ўражанне, якому не перашкаджае і іх тэхнічная аднатыповасць.

У шостым нумары, як і ў папярэдніх, рэдакцыя дае чытачам матэрыялы на розпастойныя тэмы. Адкрываецца ён артыкулам «Беларускі народ у барацьбе за сваю чэсць, свабоду і незалежнасць», у якім падведзены вынікі партызанскай барацьбы беларускага народа супроць нямецкіх душагубаў. Гэтай-жа тэме прысвечан і артыкул генерал-маёра, Героя Совецкага Саюза тав. Кожара «Партызаны Гомельшчыны».

... І вось Беларусь вызвалена. Па яе дарогах і трактах ідуць совецкія воіны. З эвакуацыі вяртаецца беларускае насельніцтва. Што адкрылася іх вачам на палях Беларусі? Руіны гарадоў і вёсак, разбурэнні і спусташэнні—сляды нямецкага варварства. Пра ўсё гэта апавядае пісьменнік Міхась Лынькоў у нарысе «На Радзіме». З гневам расказаўшы пра зверствы немцаў на беларускай зямлі, М. Лынькоў кліча беларускі народ да бязлітаснай помсты ворагам-немцам.

З цікавым «Прывітаннем беларусам» выступае ў нумары прафесар Пражскага Універсітэта, пяперашні міністр асветы Чэхаславакіі, Здэнек Неедлы. Робячы экскурс у мінулае, ён прыводзіць два цікавыя факты спрадвечнай дружбы чэхаў і славакаў з беларусамі: работу Іероніма Пражскага ў Беларусі і Георгія (Францыска) Скарыны—у Празе.

«Трагедыя гета»—так называецца артыкул Ільі Эрэнбурга, пабудаваны на фактах нямецкіх зверстваў над яўрэйскім насельніцтвам Беларусі. Ілья Эрэнбург канчае артыкул словамі:

«Вялікія пачуцці правяраюцца ў вялікіх выпрабаваннях. Агульнае гора спаяла беларусаў і яўрэяў. Разам яны ваююць, разам рвуцца ў Берлін: пакараць забойцаў. У адной з брацкіх магіл я бачыў побач два трупы: смуглявы яўрэйскі хлопчык і светлавалосая беларуская дзяўчынка. Мы іх не забудзем: ні ў Берліне, калі нямецкай крывёю мы напішам словы смертнага прысуду, ні потым, пасля перамогі, калі разам будзем будаваць цудоўную Беларусь».

У часопісе многа матэрыялаў па гісторыі Беларусі.

З прозы ў нумары змешчаны апавяданні Ільі Гурскага, Усевалада Краўчанкі, Алеся Стаховіча. У нумары многа вершаў, першае месца сярод якіх займае ўрывак з паэмы народнага паэта БССР Якуба Коласа «Адплата».

УСЕБЕЛАРУСКІ АГЛЯД МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

Учора, 10 красавіка, у сталіцы рэспублікі пачаўся Усебеларускі агляд мастацкай самадзейнасці. Яшчэ задоўга да адкрыцця заслоны зал Беларускага дзяржаўнага тэатра імені Янкі Купалы запоўнілі калгаснікі, сяляне, рабочыя, служачыя, інтэлігенцыя—удзельнікі агляду.

Агляд адкрыўся выступленнем зводнага хору Мінска, які з вялікім уздымам выканаў Гімн Совецкага Саюза.

Сёння Усебеларускі агляд мастацкай самадзейнасці прадаўжаецца.

Першы Беларускі фронт.
У Германіі.
Совецкія грамадзяне, вызваленыя войскамі Чырвонай Арміі з нямецкай няволі ў горадзе Штаргард.
Фота Ф. Кіслова (Фотахроніка ТАСС).

АПЕРАЦЫІ САЮЗНІКАЎ НА ЗАХАДЗЕ

(Ад ваеннага карэспандэнта ТАСС)

ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯЯ ГЕРМАНІЯ, 8 красавіка. Оснабрук быў ачышчан 4 красавіка. 5 красавіка перадавыя часці саюзнікаў ужо дасягнулі ракі Везер і ачысцілі ад праціўніка горад Міндэн, які знаходзіцца якраз на поўдарозе паміж Оснабрукам і Гановерам. Наступаючыя войскі прасоўваюцца ўперад з вялікай хуткасцю, праходзячы па 32 кілометры ў дзень. Да гэтага часу галоўнымі перашкодамі на шляху саюзных войск з'яўляюцца дрэнныя масты і недахват гаручага для найбольш прасунуўшыхся калон. Супраціўленне немцаў абмяжоўваецца мясцовымі баямі за скрыжаванні дарог або проста дзеяннямі снайпераў.

У немцаў тут няма ніякай лініі абароны, ніякага фронта, ніякай арміі.

Мы правялі цэлы дзень на дарозе, па якой ідуць наступаючыя войскі з Оснабрука на ўсход. Якраз за Оснабрукам па дарозе, якая, як паведамлялася, яшчэ не ачышчана ад праціўніка, мы сустрэлі групу германскіх салдат на чале з афіцэрам. Яны ішлі ўздоўж дарогі, гатовыя здацца ў палон каму-б то ні было, але ніхто не хацеў браць іх. Крыху далей мы сустрэлі другую групу нямецкіх салдат, якія неслі вялікі белы флаг. Яны таксама хацелі, каб іх узялі ў палон. Уперадзе і ззаду іх ішлі былыя французскія ваеннапалонныя, рускія людзі, угнаныя ў рабства, польскія дзяўчаты, галандскія юнакі. У Вісінгене мы звярнулі ўлева на дарогу, якая праходзіла па лясістай мясцовасці. Амаль кожную чвэртку гадзіны або нават часцей мы сустракалі нямецкіх салдат, якія ішлі на захад без усякай аховы. На ўскраіне невялікай вёскі мы выявілі вялікую групу грамадзян саюзных краін. Сярод іх былі рускія ваеннапалонныя і людзі, угнаныя на катаржную працу, французскія ваеннапалонныя, палякі, галандцы, славены, чахі і многа італьянцаў. Каля іх сядзела група нямецкіх салдат. Вызваленыя людзі вельмі бадзёрыя. Яны вітаюць саюзных салдат з вялікім энтузіязмам. Немцы вельмі задумлівы, змрочны і моўчкі глядзяць на войскі саюзнікаў. Недалёка ад Міндэна мы сустрэлі некалькі сот германскіх ваеннапалонных, якія нагружалі грузавікі для адпраўкі іх назад у тыл. Некаторыя немцы ў вёсках, па якіх яны праходзілі, прабавалі вітаць іх. Палонныя не адказвалі. Некаторыя асуджалі іх за тое, што яны капітуліравалі. Палонныя адказвалі лаянкай.

Мясцовасць не носіць ніякіх слядоў баёў. Гарады і вёскі зусім нікрануты. Жыцце ў гарадах прадаўжаецца. Людзі ходзяць па вуліцах, працуюць на палях, вялікія чаргі стаяць перад прадуктовымі магазінамі. Чым далей у глыб Германіі, тым менш слядоў баёў. Мы праходзілі міма фабрыкі — яна працавала. Невялікі гарадок, размешчаны каля яе, зусім нікрануты. Чыгуначны вакзал у поўным парадку. Жыхары глядзяць на праходзячыя транспартныя калоны саюзнікаў з вялікім здзіўленнем, але яны добра ведаюць, што адбылося. На кожным доме вывешан белы флаг. Яны не асабліва гордыя, гэтыя пераможаныя. Яны ўсміхаюцца і кланяюцца, часам стараюцца аказаць услугі. Яны стаяць на вуліцах цэлымі гадзінамі, гледзячы, як войскі саюзнікаў ідуць на ўсход. Мы наблізаемся да Міндэна, які быў ачышчан за некалькі гадзін да гэтага. Мірны ландшафт, ніякіх адзнакаў баёў, ніякага шуму бітвы. Раптам паявіліся два германскія знішчальнікі. Яны спікіравалі на транспартную калону, але, натыкнуўшыся на інтэнсіўны агонь зенітак, скрыліся ў воблаках. Вось і ўсё. На працягу цэлага дня мы бачылі толькі гэтыя два знішчальнікі — адзіную адзнаку германскага супраціўлення. Вяртаючыся назад, мы сустрэлі новыя войскі саюзнікаў, якія прасоўваліся ўперад. Арміі саюзнікаў рухаюцца з такой быстрынёй, якую дапускаюць дарогі.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

ЛОНДАН, 10 красавіка. (ТАСС). У паведамленні штаба вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў гаворыцца, што войскі саюзнікаў, якія фарсіравалі раку Эмс, значна прасунуліся за Латэн. На поўдні ад Брэмена, дзе саюзнікі занялі Басум і Рыдэ, супраціўленне праціўніка ўзмацняецца.

Хільдэсгейм ачышчан ад праціўніка. Войскі саюзнікаў, якія фарсіравалі раку Лейне, займаюць фронт працяжэннем у 17,5 кілометра ад Гетынгена на поўдні. На поўдні ад Бедгейма бронетанкавыя часці саюзнікаў прасунуліся на 19 з лішнім кілометраў і дасягнулі Рыта.

У паведамленні штаба пералічваюцца назвы 24 гарадоў, занятых войскамі саюзнікаў на працягу 9 красавіка.

У часе паветраных аперацый 9 красавіка знішчана на зямлі 168 германскіх самалётаў; многа варожых самалётаў пашкоджана.

ЛОНДАН, 9 красавіка. (ТАСС). Як перадае карэспандэнт агенцтва Рэйтэр, які знаходзіцца пры штабе вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў, часці амерыканскай 9-й арміі, што прасунуліся на 40 кілометраў, знаходзяцца ў 6,5 кілометра ад Гановера. Горад акружан з трох бакоў. Другія часці 9-й арміі знаходзяцца ў 32 кілометрах ад Брауншвейга

ДЗЕЯННІ АВІЯЦЫІ САЮЗНІКАЎ

ЛОНДАН, 10 красавіка. (ТАСС). Як перадае карэспандэнт агенцтва Рэйтэр, які знаходзіцца пры штабе амерыканскіх стратэгічных ваенна-паветраных сіл Еўропы, 9 красавіка каля 1250 бамбардыроўшчыкаў «Лятаючая крэпасць» і «Ліберэйтар» з саставa 8-га амерыканскага ваенна-паветранага корпуса зрабілі налёт на 10 аэрадромаў, нафтасховішчы і склад узрыўчатых вяшчэстваў у раёне Мюнхена. Бамбардыроўшчыкі ішлі ў суправаджэнні звыш 750 знішчальнікаў «Мустанг» і «Сандэрболт».

НОВЫЯ ПАДРАБЯЗНАСЦІ ВЫВАЗУ НАЦЫСТАМІ ЗАЛАТОГА ФОНДУ З БЕРЛІНА

НЬЮ-ЕРК. 9 красавіка. (ТАСС). Карэспандэнт газеты «Чыкаго Сан» паведамляе, што прадстаўнік германскага рэйхсбанка Фік, як відаць, імкнучыся атрымаць давер'е амерыканцаў, заявіў, што нацысты вывезлі залаты запас з Берліна, таму што яны лічылі за лепшае, каб ён быў захоплен амерыканцамі, а не рускімі. Ён заявіў, што, калі прадстаўнікі нацысцкага ўрада ўбачылі, што яны не змогуць вывезці золата і грошай, схаваных у саляных капальнях, да прыходу войск амерыканскай 3-й арміі, яны разлічвалі, што амерыканцы змогуць выкарыстаць захоп залатога запасу для таго, каб стабілізіраваць рэйхсмарку. Па словах Фіка, калі амерыканцы захаваюць устаноўлены акупацыйнымі ўладамі саправудны валютны курс у 10 цэнтаў за адну рэйхсмарку, а таксама захаваюць найстражэйшае нарміраванне ўсіх рыначных прадуктаў, то гэтым яны прадухіляць катастрафічную інфляцыю. Па яго словах, такім шляхам германская прамысловасць здолее выйсці з вайны валодаючы зусім здаровай фінансавай базай, што дазволіць выратаваць акцыі германскіх прамысловых і гандлёвых прадпрыемстваў. Фік заявіў, што адпраўка золата, грошай і твораў мастацтва з Берліна ў саляныя капальні, што знаходзіліся на поўдарозе паміж войскамі Чырвонай Арміі, якія стаялі на Одэры, і англа-амерыканскімі войскамі на Рэйне, пачалася 9 лютага.

ЗАМЕЖНАЯ ХРОНІКА

У будынак ваеннай місіі югаслаўскага ўрада ў Рыме была кінута бомба. Узрыў прычыніў пашкоджанні суседнім будынкам. Афяр не было.

* * *

Японскае інфармацыйнае бюро аб'явіла аб назначэнні барона Кіцыро Хірануме прэзідэнтам тайнага совета замест адмірала Судзукі, які заняў цяпер пост прэм'ер-міністра Японіі.

* * *

Французскае ваеннае міністэрства прыступіла да фарміравання 2-й французскай арміі, якая будзе эпікіравана і ўзброена абмундыраваннем і снаражэннем, атрымліваемым як ад саюзнікаў, так і французскіх заводаў.

Спецыяльны трыбунал у Любляне прыгаварыў да пакарання смерцю генерала Кэрачэўскага, які абвінавачваўся ў супрацоўніцтве з немцамі і ва ўдзеле ў забойствах польскіх і совецкіх ваеннапалонных.

МЕЗЕРЫТЦКІЯ ПАДЗЯМЕЛЛІ

Гладкі асфальт шасе. З бакоў зялёныя квадраты азімых. Шэрыя кавалкі ўзаранай з восені зямлі, сасновыя гаі, азёры, узгоркі. Мірны веснавы пейзаж. Але вось шасе ўзбягае на прыгорак, і перад вачыма раптам узнікае новы малюнак. Далёка ўправа і ўлева, наколькі ахопіць вока, за велізарным пропітанкавым рвом цягнуцца зігзагі белых надаўб.

Гэта так званыя «зубы дракона»—першы рад мезерытцкіх умацаванняў одэрскага абарончага чатырохвугольніка.

Праходзім паміж чатырма радамі надаўб. Вось снарад, які разарваўся прама сярод іх, раскрыў карэнні гэтых драконавых зубоў. Мы бачым маналітны, на паўтара метры ў зямлі, жалезабетонны фундамент, з якога нібы выраслі белыя вострыя трохвугольнікі-зубы. Ні звярнуць у бок, ні вырваць такі зуб немагчыма.

Перад рвом і за надаўбамі апутаныя калючым дротам мінныя палі, акопы, траншэі ў спіралях калючага дроту, электрычнага праводу.

У кілометры, месцамі бліжэй ад гэтых загарод, цягнецца града ўзгоркаў з цёмнымі круглымі верхавінамі. Ідзем да аднаго з такіх узгоркаў. На яго верхавіне стаяць чатыры велізарныя сталёвыя каўпакі. У іх амбразуры, наглядальныя шчыліны. Чарнеюць дулы гармат. Шэрай сталлю блішчаць ствалы кулямётаў. Ды гэта не дот, гэта цэлая крэпасць, форт!

Спускаемся да ўваходу ў казематы. Невялікая пляпоўка, жалезабетонная сцяна з некалькімі, мабыць, вентыляцыйнымі адтулінамі. За адчыненымі сталёвымі дзвярыма авальны праход. Па вузкіх вітых лесніцах спускаемся ўніз да форта № 717. Усюды на сценах чорныя электрычныя правады, нейкія кнопкі, рычагі, размеркавальныя шчыты. Тут усё было электрыфікавана. Націскам кнопкі, або рухам рычага зачыняліся і адчыняліся цяжкія дзверы, падаваліся да гармат і кулямётаў боепрыпасы, узнімаліся і апускаліся ложкі ў казарме, вентыліраваліся памяшканні. Цэлай сістэмай рычагоў і кнопак праводзілася ўпраўленне баявой тэхнікай форта.

Сталёвыя вінтавыя лесніцы вядуць наверх, да каўпакоў-байніц, наглядальных шчылін. Усюды штабялі скрынак з патронамі, снарадамі, мінамі, балоны з гаручай вадкасцю для агнямётаў. Калі ўсё гэта прывесці ў рух, форт можа выкідаць са сваёй падземнай утробы бясконцую колькасць далёкага і блізкага агню. Усё вакол гэтага зялёнага і з выгляду зусім мірнага ўзгорка будзе гарэць, палаць і ірвацца.

Совецкія войскі прарвалі мезерытцкія ўмацаванні ў двух месцах і, імкліва рушыўшы зноў у брэшы, абыйшлі асноўныя форты, блакіравалі іх, заперлі ворага ў яго падземных збудаваннях, а затым, дэзарталізаванага, вымусілі да капітуляцыі. У гэтых умацаваннях былі ўзяты ў палон тысячы варожых салдат і афіцэраў.

Спускаемся яшчэ метраў на 20 уніз. Падземная галерэя, якая нагадвае тунель метро. Толькі тут цёмна, сыра. Мясцамі з-пад бетона цячэ вада. На зямлі рэйкі вузкакалейкі.

Кілометра паўтара або два ідзем абсалютна цёмным калідорам, і нарэшце выходзім у галоўную галерэю. Тут змрочна мігацяць электрычныя лямпачкі, ля сцяны стаяць станкі, каля станкоў—скрынкі з інструментам, скрынкі дэталей.

Бясконцы рад станкоў — токарных, стругальных, шліфавальных—цягнецца ўздоўж тунеля на працяжэнні 15 з лішнім кілометраў. Сюды, у мезерытцкія падземеллі перацягнулі немцы ў 1943 годзе адзін з авіяматорных заводаў фірмы «Мерседэс Бенц». Яны не толькі прыгналі сюды тысячы нявольнікаў, але і, не гледзячы на абсалютную непрыстасаванасць вузкай галерэі для вытворчасці, пусцілі станкі ў ход. Завод вырабляў важныя дэталі авіяматораў.

Зусім нядаўна ў гэтых падземеллях, ля гэтых станкоў працавалі тысячы людзей. Гэта былі нашы совецкія дзяўчаты з Украіны, Смаленшчыны, Віцебшчыны.

Падземелле забівала людзей. Нашы байцы, якія аглядалі галоўную гэтую галерэю, вызначылі, што год работы ў гэтых умовах адбіраў не менш 10—15 год жыцця ў чалавека, ператвараў здаровага рабочага ў інваліда з сухотнымі бактэрыямі ў лёгкіх і канечнасцях, хворых рэўматызмам.

Лёс людзей, якія працавалі тут, пакуль яшчэ невядомы. Або ўсе яны ўвезены, або забіты дзе-небудзь паблізу. Асталіся толькі сляды іх прабывання тут. У шматлікіх адсеках галерэі мы бачым брудныя нары ў два паверхі. Значная частка рабоў, як відаць, і жыла пад зямлёй.

Мы выйшлі з падзямелля ўсхваляваныя ўсім бачаным.

Падпалкоўнік Сарокін, пяперашні камендант і начальнік гарнізона мезерытцкіх падзямелляў, даноўніў нашы назіранні падрабязным апавяданнем аб 36—40 кілометрах падземных збудаванняў з іх галерэямі, тунелямі, адсекамі, фартамі-дотамі.

Аказваецца, бачанае намі—гэта далёка не ўсё. Кілометрах у 12 ад аспоўнага тунеля ў вялікіх адсеках пад недабудаваным дотам зусім нядаўна выяўлены сховішчы музейных каштоўнасцей, награбленых немцамі ў Совецкім Саюзе. Там-жа знойдзены велізарныя склады інструментаў, электраабсталявання, дэталі каштоўных машын. Усё гэта было замуравана глыбока пад зямлёй.

На выпадак захопу абарончых збудаванняў немцы падрыхтавалі азёры, якія знаходзяцца паблізу, для затаплення ўсіх падзямелляў, але выканаць гэтага не паспелі. Не паспелі яны ўзарваць праходы і доты. У тунелях і адсеках нашы сапёры выявілі многа тон узрыўчаткі.

Не ўсе замураваныя адсекі, не ўсе хады яшчэ ўскрыты і абследаваны, і хто ведае, якія яшчэ жудасныя тайны тояць мезерытцкія падзямеллі.

Б. АФАНАСЬЕЎ,
А. МАЛІБАШЭЎ.

Мезерытц, 9 красавіка.
(Спец. кар. ТАСС).

Адказны рэдактар
В. САМУЦІН.

СЕННЯ У КІНОТЭАТРАХ:

Кінотэатр «Першы» «НАШЭСЦЕ»

Кінотэатр «Беларусь» «ЭДЫСОН»

Кінотэатр «Радзіма» «МАЯ ЛЮБОЎ»

Дзіцячы кінотэатр «ПАДКІДЫШ».

АТ28717 АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Пушкіна, 55, 3-ці паверх. Тэлефоны: Адказнага рэдактара—149, Адказнага сакратара—150.